Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Парплішчанская сярэдняя школа Докшыцкага раёна»

# Сацыяльна значны праект
# «Памяць пра мінулае дзеля будучых пакаленняў»

**Намінацыя**

**захаванне гістарычнай памяці і культурнай спадчыны краіны**

Аўтар праекта: Вайцяшонак Алёна Юр'еўна

Тэрмін рэалізацыі праекта:
кастрычнік 2021-люты 2022

## Мэта праекта:

фарміраванне пачуцця патрыятызму, павагі да гістарычнага мінулага, нашых традыцый праз захаванне гістарычнай памяці і спадчыны малой радзімы.

## Задачы праекта:

- стварыць умовы для рэалізацыі патрыятычных якасцяў навучэнцаў школы ў канкрэтнай сацыяльна значнай справе;
- Вызначыць месцазнаходжанне памятных месцаў, што сведчаць аб гістарычным мінулым аграгарадка Порплішча;
- Аднавіць храналогію гістарычных падзей, што адбываліся на тэрыторыі нашага аграгарадка;
- Развіваць пазнавальны інтарэс, актыўнасць, жаданне пазнаць сваю малую радзіму;
- Развіваць творчыя здольнасці навучэнцаў праз арганізацыю пошукавай дзейнасці.

## Мэтавая аўдыторыя:

навучэнцы, жыхары аграгарадка Порплішча, турысты.

# Актуальнасць і сацыяльная значнасць праекта:

У цяперашні час грамадскае развіццё краіны патрабуе выхавання сацыяльна-актыўных, самастойных, творчых асоб, адаптаваных да ўмоў сучаснага жыцця. Ад таго, наколькі развіта пачуццё патрыятызму кожнага члена грамадства, залежыць лёс нашай Радзімы. А любоў да Радзімы, як вядома, пачынаецца з малога: сваёй вёскі, вуліцы, землякоў. Сапраўдны патрыятызм немагчымы без ведання гісторыі сваёй малой радзімы.

Радзіма… Айчына… У каранях гэтых слоў блізкія кожнаму вобразы: маці і бацька, бацькі, тыя хто дае жыццё новаму чалавеку. Выхаванне пачуцця патрыятызму – працэс складаны і працяглы. Любоў да блізкіх людзей, да роднага краю і роднай краіны адыгрывае вялікую ролю ў станаўленні асобы .

У апошнія гады адбываецца пераасэнсаванне сутнасці патрыятычнага выхавання: ідэя выхавання патрыятызму і грамадзянскасці набывае ўсё большую грамадскую значнасць, становіцца задачай дзяржаўнай важнасці. Пры гэтым акцэнт надаецца на выхаванне любові да малой радзімы.

2022 год у Беларусі абвешчаны Годам гістарычнай памяці. Год гістарычнай памяці – гэта вельмі важна для нашай сучаснасці, напоўненай мабільнасцю, мітуснёй і ўсімі тымі перашкодамі, якія знішчаюць самыя галоўныя каштоўнасці чалавека. А гістарычная памяць бярэ свае вытокі з ведання гісторыі сваёй малой радзімы, таго месца, дзе ты нарадзіўся і жывеш.

# Этапы рэалізацыі праекта

## Змест праекта

Па ініцыятыве піянераў школы пад кіраўніцтвам настаўніка гісторыі, было вырашана паглыбіць, абагульніць і сістэматызаваць сабраны матэрыял аб гісторыі аграгарадка Порплішча, архітэктурных помніках, падзеях Вялікай Айчыннай вайны, стварыць інфармацыйныя шыльды і размясціць іх на аб'ектах аграгарадка, бо гэта важны сродак інфармацыі і папулярызацыі гісторыі сярод жыхароў аграгарадка і турыстаў.

Акрамя таго, знаёмства з гістарычным мінулым роднага краю дапаможа ў выхаванні патрыятызму сярод падрастаючага пакалення.

Пры рэалізацыі праекта выкарыстоўваюцца разнастайныя формы і метады работы: пошукава-даследчая дзейнасць, відэафільм, творчая работа, сустрэчы за круглым сталом, праца з успамінамі, сацыялагічнае апытанне.

Зыходзячы з задач рэалізацыя праекта ажыццяўлялася па этапах: падрыхтоўчы, асноўны, заключны.

## Сацыяльнае партнёрства

Для рэалізацыі асноўных мерапрыемстваў праекта былі выбраны сацыяльныя партнёры: ААТ «Барсучанка», Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Парплішчанская сярэдняя школа” Докшыцкага раёна, Парплішчанскі сельскі выканаўчы камітэт.

Партнёрскае ўзаемадзеянне было замацавана вуснымі падтрымкамі арганізацый.

## Бюджэт праекта

Пазабюджэтныя сродкі: 25руб. 00 капеек для друку інфармацыйных шыльдаў.

Усяго 25 руб. 00 капеек.

# Падрыхтоўчы этап

| Тэрмін | Форма і назва мерапрыемства | Адказныя |
|---|---|---|
| ***Кастрычнік 2021*** | Выбар тэмы. Вызначэнне мэты і задачы | Актыў БРПА |
| | Вывучэнне літаратуры, матэрыялаў па тэме | |
| | Сацыяльнае апытанне вучняў 5-8 класаў | |
| | Вызначэнне і склад спісу гістарычных аб’ектаў | |







# Асноўны—пазнаваўча-творчы этап

| | | |
|---|---|---|
| Ліст апад 2021 | Даследчая работа”Святыні агр. Порплішча: сучаснасць і мінулае”. | Настаўнік гісторыі Крук Н.М., актыў БРПА |
| | Сустрэча за круглым сталом з настаяцелем Спаса-Праабражэнскай царквы Віктарам Гмірам. Фільм «Зваротны адлік. Магія гуку» | Ініцыятыўная група |
| | Творчая работа. Распрацоўка эскізаў інфармацыйных шыльдаў “Спаса-Праабражэнская царква”, “Касцёл Дзевы Марыі Каралевы Польскай” | Настаўнік гісторыі Крук Н.М., актыў БРПА |



| | | |
|---|---|---|
| Снежань 2021 | Рубрыка: знаёмцеся. Альбіна Аліноўская—украінская пісьменніца з парплішчанскімі каранямі. Фільм «Рэквіем па мары» | Школьны бібліятэкар Сауліч Л.Т., актыў БРПА |
| | Вечар успамінаў з былой настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Сауліч І.А. | Актыў БРПА, бібліятэкар школы Сауліч Л.Т. |
| | Вывучэнне інтэрнетрэсурсаў. | Актыў БРПА |
| | Творчая работа. Распрацоўка эскіза інфармацыйнай шыльды “Альбіна Аліноўская” | Настаўнік гісторыі Крук Н. М., актыў БРПА |
| | Даследчая работа “Гісторыя вайны ў лёсе маіх землякоў” | Настаўнік гісторыі Крук Н. М., актыў БРПА |
| | Праца з артыкуламі газеты “Родныя вытокі” | |
| | Стварэнне эскіза інфармацыйнай шыльды “Ваенная гісторыя вёскі” | Настаўнік гісторыі Крук Н. М., актыў БРПА |














У **1943 годзе** недалёка ад чыгу…
аховы чыгуначнага палатна. Капала іх мясцо…
вартавых. У бункерах не было вады, таму жыхары мясцовы…
туды ваду. Але з калодзежа немцы ваду налівалі самі, не давяралі мя…

У **лістападзе 1943 года** партызаны брыгады імя ЦК КП(б)Б … украінцаў з брыгады Радзівонава разграмілі нямецкі гарнізон, які ахоўваў чыгун… бункеры знаходзіліся 17 чалавек - 14 немцаў і 3 ўкраінскія ўласаўцы.

У партызанскай групе было 20 байцоў - 12 партызан і 8 падпольшчыкаў. У баявой аперацыі ўдзельнічаў першы сакратар райкама КП(б)Б Уладзімір Свірыд. Дзяжурнага немца на вышцы ля бункера ліквідавалі без адзінага гуку.

У бункеры закідалі гранатамі праз комін. У ходзе бою былі забіты 15 фашыстаў. Два ўкраінцы перайшлі на бок партызан.

У той жа час была разгромлена казарма ў вёсцы Порплішча. У ёй знаходзіліся 10 немцаў. Былі ўзарваны чыгуначныя масты і мост на бальшаку Докшыцы-Глыбокае.

Агульныя трафеі пад час аперацыі: 2 кулямёты, 30 вінтовак, 2 мінамёты, вялікая колькасць патронаў, мін і гранат, адзенне і прадукты. Памяшканне бункера і казармы, дзе былі трупы немцаў, было спалена.

Пасля гэтых падзей нямецкае камандаванне планавала спаліць вёску Порплішча, але, на шчасце, гэтага не адбылося.



# Заключны этап

| | | |
|---|---|---|
| Люты 2022г | Сістэматызацыя матэрыялаў. Адпраўка шыльдаў у друк. | Настаўнік гісторыі Крук Н.М., актыў БРПА |
| | Выраб інфармацыйных шыльдаў. | Настаўнік працоўнага навучання Шылавіч Ю.Я., ініцыятыўная група БРПА |
| | Размяшчэнне інфармацыйных шыльдаў на гістарычных аб’ектах і памятных месцах. | Актыў БРПА |




















# *Маніторынг эфектыўнасці рэалізацыі праекта*

***Праектам “Памяць пра мінулае дзеля будучых пакаленняў” былі ахоплены вучні 5-8 класаў, у колькасці 32 чалавекі, 10-13 гадоў. З мэтай рэалізацыі плана быў арганізаваны і праведзены круглы стол, выстава матэрыялаў перыядычнага друку, прагледжаны відэафільмы, прысвечаныя гісторыі Спаса-Праабражэнскай царквы, фільмы пра жыццёвы і творчы шлях Альбіны Аліноўскай, створаны самімі вучнямі фільм «Сівая легенда», які расказвае пра гісторыю ўзнікнення вёскі. Праведзена даследчая работа і сістэматызацыя напрацаваных матэрыялаў па гісторыі аграгарадка.***

***Для пацвярджэння павышэння ўзроўню ведаў вучняў пра гісторыю малой радзімы было праведзена паўторнае сацыялагічнае апытанне. Па выніках апытання узровень ведаў пра гістарычннае мінулае аграгарадка значна павысіўся, акрамя гэтага павысілася цікавасць і мэтазгоднасць да правядзення такіх мерапрыемстваў у школе***

***Пры рэалізацыі праекта выкарыстоўваліся сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і тэхнічныя сродкі.***



# Кантактныя дадзеныя аўтара праекта

Вайцяшонак Алёна Юр'еўна
Хатні адрас: 211721 Віцебская вобласць, Докшыцкі раён, агр. Порплішча, вул. Школьная, д.23
Тэлефон: 375336315242